# 20 ліпеня 2024 г. – 80 гадоў з дня вызвалення Кобрына і Кобрынскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (1944)



Аперацыя па вызваленні Беларусі пад кодавай назвай «Баграціён» пачалася 23 чэрвеня 1944 года. 3 ліпеня ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была вызвалена сталіца нашай рэспублікі Мінск. Кожны дзень прыносіў звесткі аб вызваленні ўсё новых гарадоў і вёсак.

Кобрын з'яўляўся важным апорным пунктам немцаў на брэсцкім напрамку. Фашысты стварылі тут магутныя ўмацаванні, вырашыўшы надоўга затрымаць рух войскаў Чырвонай арміі. Пачынаючы з мая 1944 года, на подступах і ў горадзе сталі ўзводзіцца жалезабетонныя і земляныя збудаванні. На паўднёвую ўскраіну сагналі амаль усё насельніцтва рыць супрацьтанкавыя равы.

Група патрыётаў па заданні партызан нанесла на карту абарончую сетку праціўніка, паказала ўсе шляхі падыходу да горада. Увечары 19 ліпеня 1944 года да Кобрына падышлі часці 61-й арміі 1-га Беларускага фронту. Перад савецкімі воінамі была пастаўлена задача: не наносячы пашкоджанняў гораду, узяць яго з ходу, не даючы ворагу апамятацца, адсякаць яго ад шашы, перарэзаць шляхі адступлення на Брэст. Асноўны ўдар па Кобрыну быў нанесены ў ноч на 20 ліпеня 37-м гвардзейскім палком. Злева і справа яго падтрымлівалі 32-і і 39-ы стралковыя і 29-ы артылерыйскі палкі і іншыя часці.

Нягледзячы на лютае супраціўленне праціўніка, раніцай 20 ліпеня ў ходзе наступальнай Люблінска-Брэсцкай аперацы Кобрын быў вызвалены. У горадзе і на чыгуначнай станцыі былі захоплены склады з ваеннай маёмасцю, вагоны, платформы і паравозы.

Некалькімі днямі раней вызваленне прыйшло ва ўсходнюю частку Кобрыншчыны, якая адносілася тады да Антопальскага раёна. 61-я армія пад камандаваннем генерала П. А. Бялова

ва ўзаемадзеянні з конна-механізаванай групай генерала І. А. Пліева разграмілі 102-ю і 192-ю пяхотныя нямецкія дывізіі і працягвалі наступаць на Кобрын. 21 ліпеня часцямі 212-й стралковай дывізіі (палкоўнік У. Г. Кучынёў) быў вызвалены Дзівін, цэнтр аднайменнага раёна, тэрыторыя якога ўваходзіць зараз у склад Кобрынскага раёна.

Добрай падмогай рэгулярным войскам Чырвонай арміі сталі партызанскія злучэнні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Кобрынскага раёна. Партызаны атрадаў імя Чапаева, імя Паставалава і імя Арлова брыгады імя Чапаева вялі баі за вёскі Баршчы, Стрыі, перарэзалі дарогу Баршчы – Казішча і ўтрымлівалі яе да падыходу войскаў, не даючы магчымасці фашыстам адводзіць свае войскі па гэтай дарозе. Акрамя таго, атрады вылучалі сваіх праваднікоў, якія праводзілі савецкія часці па бездарожжы і багністым месцам. Падчас наступальных баёў партызанскія атрады аказвалі вялікую дапамогу ў садзейнічанні і выкананні баявой задачы па знішчэнні разрозненых груп немцаў.

12 вайсковым злучэнням і часцям 1-га Беларускага фронту, якія асабліва вызначыліся ў баях за Кобрын, загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага нададзена ганаровае найменне «Кобрынскіх».

1124 дні фашысцкай акупацыі Кобрыншчыны забралі жыццё многіх жыхароў. Загінула больш за 13 тысяч жыхароў горада і раёна, сярод якіх амаль 6,5 тысяч яўрэйскага насельніцтва. Вораг цалкам знішчыў дзевяць населеных пунктаў, 1142 жылыя дамы, 19 школ, 11 прамысловых будынкаў. Акупанты нанеслі велізарны ўрон Кобрыну: трэцяя частка жылога фонду была разбурана. Перад бегствам з горада фашысты вывелі са строю чыгуначную і тэлефонна-тэлеграфную станцыі, узарвалі масты, разбурылі і спалілі больш за 200 жылых дамоў, звыш 250 іншых пабудоў.

Недалёка ад Кобрына падчас падрыхтоўкі аперацыі па вызваленні Брэста здзейсніў свой апошні подзвіг Арсеній Іванавіч Марозаў. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1959 годзе астанкі А. І. Марозава былі перанесены ў сквер імя В. П. Пуганава, яго імя носіць адна з

вуліц. Там у брацкай магіле пахаваны 174 воіны і партызаны, якія загінулі пры вызваленні горада. Два надмагіллі на магілах абаронцаў Кобрына – Віктара Пуганава і Арсенія Марозава – сімвалізуюць пачатак і заканчэнне вайны для Кобрыншчыны.

Адразу пасля вызвалення ад фашысцкай акупацыі на тэрыторыі раёна пачало наладжвацца мірнае жыццё. Аднаўлялася вытворчасць, адчыняліся школы і бальніцы, узводзіліся масты і дарогі, будавалася жыллё. Жыхары з энтузіязмам збіралі прадукты і грошы, каб дапамагчы фронту, і змагаліся з бандытызмам.

Як памяць і глыбокая пашана да загінуўшых стаяць сёння ў горадзе і раёне помнікі ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. У 1965 годзе ў гонар вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў устаноўлена стэла, у 1985 годзе на яе месцы ў азнаменаванне 40-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй адкрыты помнік, на плітах якога высечаны назвы падраздзяленняў, якія вызвалялі горад.

Памяць аб героях вызвалення захоўваецца ў Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава. У Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы сфарміраваны краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы «Край у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Салдаты Перамогі. Ветэраны Вялікай Айчыннай».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Беларусь** у Вялікай Айчыннай ввайне : день за днём (ілюстраваная храналогія). – Мінск : Беларусь, 2004. – 231 с. : іл.

См на с.171,172.

**Бурдыко, Г. В.** 60-летие освобождения Беларуси и Кобринщины от немецко-фашистских захватчиков – знаменательное событие в истории нашей большой и малой Родины / отдел идеологической работы ; Г. В. Бурдыко // Информационно-методический бюллетень. – Кобрин, 2004. – С. 30-40.

**Великий** освободительный поход. – Москва : Политиздат,1970. - 312 с.
См. на с. 12-15.

**Ермаловіч, В. І.** Вызваленне Беларусі ад нямецкіх акупантаў / В. І. Ермаловіч // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) / В. І. Ермаловіч. – Мінск, 2014. – С. 78–107.

**Ивановский, Е. Ф.** Победы немеркнущий свет / Е. Ф. Ивановский. – Минск : Беларусь, 1985.
См на с. 20.

**Казлоўская, М. М.** Помнік вызвалення / М. М. Казлоўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. - С. 225 : фат.

**Камінскі, М. І**. Кобрынскія вайсковыя часці / М. І. Камінскі // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя. - Мінск, 1990. - С. 270.

**Кобрынскі раён** // Памяць Беларусі : рэспубліканская кніга. - Мінск, 1995. - С. 78–83.

**Маленков, А. Ф.** Освобождение Кобрина / А. Ф. Маленков // Лавиной грозной к Бресту / А. Ф. Маленков. – Санкт-Петербург, 1994. – С. 155-184.

**Мальков, Д. К**. От Пинска до Бреста : [воспоминания командира 12-й гвардейской стрелковой дивизии] / Дмитрий Кузьмич Мальков // Буг в огне : [сборник]. - Минск, 1977. – С. 413–420.

**Освобождение** Беларуси, 1943–1944 : [материалы и документы]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 943 с., ил.
См на с. 767,769,808,872.

**Плиско, Н. М**. Вызваленне / Н. М. Плиско // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 23—231 : фат.

**Плиско, Н. М**. Ночь в 1124 дня / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов // Кобрин : историко-экономический очерк / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов. – Минск, 1987. – С. 57-71.

**Подорожный, Н. А.** Радость освобождения / Н. А. Подорожный // По дорогам юности моей / Н. А. Подорожный. – Москва, 1987. – С. 73-91.

**Яны** вызвалялі Кобрыншчыну / падрыхтавалі А. В. Бабенка [і інш.] // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С.232-239 : фат.

**#Равнение на героев.** Они принесли нам свободу / [подготовила Жанна Елизарова по материалам Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова] // Кобрынскі веснік.- 2023. - 29 ліпеня (№ 52). - С. 14-15 : фот.

**Герои-освободители** / подготовила Жанна Елизарова по материалам Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова // Кобрынскі веснік. - 2023. - 29 ліпеня. – С. 15.

О героях-освободителях Кобринщины П. А. Белове, Д. К. Малькове, А. И. Деревянко, И. М. Матвееве, Н. Д. Мельнике.

**Елизарова, Ж.** Всегда на страже. Таямніцы зямлі кобрынскай / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2022. - 16 сакавіка (№ 19). – С. 4-5 : фот.

О боевых действиях, проходивших на территории Кобринщины во время Великой Отечественной войны, в т. ч. освобождение района.

**Кирилюк, Л.** Помним и гордимся... / Лилия Кирилюк, Анна Чеб // Кобрин-информ. - 2019. - 18 июля (№ 29). - С. 4 ; 25 июля (№ 30). — С. 4 : фот.

О воинских частях и героях-командирах, которые успешно руководили операцией по освобождению г. Кобрина от немецко-фашистских захватчиков.

**Курашова, Л.** Долгожданное освобождение : [г. Кобрина в 1944 г.] / Лидия Курашова // Заря. - 2019. - 20 июля. - С. 9.

**Дубина, Л.** Нина Ковалева: "Я помню бой за Кобрин" / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 16 ліпеня. – С. 2.

**Дворецкий, М.** Поздравление от Рокоссовского / Моисей Дворецкий // Заря. - 2015. — 2 апреля. — С. 8.

О М. М. Панцевиче, подполковнике 89-го стрелкового корпуса, в 1944-м освобождавшем Кобрин от фашистов.

**Чирун, А**. Победителям посвящается!.. / Александр Чирун // Кобрин-информ. - 2015.— 16 июля. — С. 7.

Из воспоминаний непосредственных участников боевых действий в июле 1944 года, освобождавших Кобринщину от фашистов.

**Курашова, Л**. "Здешняя земля начинена осколками мин и снарядов, обильно полита кровью наших солдат..." / Лидия Курашова // Кобрынскі веснік. - 2014. — 19 ліпеня. — С. 3.

20 июля – день освобождения Кобрина от фашистских захватчиков.

**Гриневич, Н.** "Мы ждали и приближали Победу" / Николай Гриневич, [записала] Светлана Савчук // Кобрынскі веснік. - 2013.— 23 лістапада. — С. 4.

К 70-летию освобождения Беларуси - воспоминания кобринчанина Н. Гриневича об освобождении Кобрина.

**Курашова, Л.** Кобрин. Долгожданное освобождение / Лидия Курашова // Кобрин-информ. - 2013. — 18 июля. — С. 11.

**Мельнік, Р.** Змагаліся з фашызмам, вызвалялі родны край / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2013. – 20 ліпеня. – С. 3.

Успаміны вызваліцеляў Кобрына М. Пекута, У. Міжэўскага.

**Дворецкий, М**. Этих дней не смолкнет слава... / Моисей Дворецкий // Заря. - 2012. - 2 августа. - С. 18.

**Мартынов, А.** Тем временем в городе / Алексей Мартынов // Кобрынскі веснік. – 2012. – 21 ліпеня. – С. 3.

Об освобождении Кобрина.

**Савченко, Н.** Так пришло освобождение. В июле 1944-го / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. - 2012. - 21 ліпеня. - С. 3.

**Савченко, Н.** Освобождение / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. – 2011. – 16 ліпеня. – С. 4, 9-10.

Хронология освобождения Кобрина, Кобринского района.

**Дворецкий, М.** В боях за Кобрин и Брест / Моисей Дворецкий // Заря. – 2010. – 25 февраля.

**Назарук, Т.** Освобождение Кобрина глазами очевидцев / Татьяна Назарук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 2 ліпеня. – С. 2.

**И пришло** освобождение // Кобрынскі веснік. - 2010. - 17 ліпеня. - С. 2.

**Савченко, Н**. Я – из Кобринского гвардейского… / Надежда Савченко // Кобрынскі веснік. – 2009. – 1 ліпеня. – С. 2.

Из воспоминаний сибиряка Алексея Шарапова, освобождавшего Кобрин в июле 1944 в составе 37-го гвардейского полка.

**Как** это было // Кобрынскі веснік. – 2009. – 18 июля. – С. 2.

Об освобождении Кобрина от немецко-фашистских захватчиков.

**Светлый** день освобождения // Кобрынскі веснік. – 2007. - 21 ліпеня.

Освобождение Кобрина, подвиг А. И. Морозова.

**Михнюк, В.** Ночью взяли Кобрин / В. Михнюк // Кобрынскі веснік. - 2006. - 22 ліпеня. - С. 2.

Освобождение Кобрина.

**Деревянко, А.** Мирного неба вам и благополучия! / А. Деревняко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 ліпеня. – С. 2.

Воспоминания Андрея Деревянко, участника освобождения Кобрина.

**Деревянко, А.** Не забыть эти дни / А. Деревянко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 23 июля.

Воспоминания участника освобождения Кобрина А. Деревянко.

**Мартынчук, Р.** У тыле ворага страляў кожны куст / Рыгор Мартынчук // Кобрынскі веснік. – 2004. – 17 ліпеня. – С. 5.

Успаміны Рыгора Мартынчука, які ўдзельнічаў у баях за вызваленне Кобрыншчыны.

**Павлова, М.** Памяти и сердца связующие нити / Мария Павлова // Кобрынскі веснік. – 2004. – 17 ліпеня. – С. 5.

Об участнике освобождения Кобрина А. И. Деревянко.

**Рысь, Е.** Та страшная война / Елена Рысь // Кобрынскі веснік. - 2004. – 17 ліпеня. – С. 5.

Освобождение г. Кобрина.

**Назарук, Т.** Освобождение Кобрина глазами очевидцев / Татьяна Назарук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 2 ліпеня. – С. 2.

**Плиско, Н.** Это их город / Н. Плиско // Кобрынскі веснік. – 1999. – 17 ліпеня. – С. 2.

Освобождение Кобрина от фашистских захватчиков.

**Хроніка вызвалення** // Кобрынскі веснік. - 1999. - 17 ліпеня. - С. 2.

Хроніка вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў.

**Мартынаў, А.** Кобрын: ліпень 1944–га /А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1989. – 20 ліпеня. – С. 2-3.

**Амельянчук, Н.** І жыцце перамагло / Н. Амельянчук // Камуністычная праца. – 1987. – 18 ліпеня.

Вызваленне Кобрына.

**19-20 ліпеня** 1944 года : хроніка вызвалення Кобрына // Камуністычная праца. – 1984. – 21 ліпеня.

**Фралоў, П.** Яны вызвалялі Кобрын / П. Фралоў // Камуністычная праца. – 1983. – 1 снежня.

**Мацвееў, І.** Напомнілі радкі дзенніка / І. Мацвееў // Камуністычная праца. – 1980. – 15 красавіка.

Кобрынскі Чырванасцяжны полк ордэнаў Суворава і Кутузава ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына.

**Александровіч, Б.** У 44-м, пад Кобрынам / Б. Александровіч // Беларусь. – 1978. - № 9. – С. 19.

**Яны** вызвалялі наш горад // Камуністычная праца. – 1973. - 19 ліпеня.

Кобрынскі раён
Кобрын
Вызваленне Беларусі
Вялікая Айчынная вайна